**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу, сацыякультурнай дзейнасці і метадычнай работы**
# Хроніка
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за кастрычнік 2024 г.**

## Мерапрыемствы да Дня сталага чалавека

**1 кастрычнік. Кобрын**

У чытыльнай зале прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Согреем душу теплым словом». Перад гасцямі з віншаваннем выступіла вакальная група бібліятэкі «Фантазия», артысты Кобрынскага псіханеўралагічнага дома-інтэрната і аматарскі тэатр-студыя «Пирожок» з фрагментам спектакля «Вся власть пенсионерам».

Установа, 46 чал.

**2 кастрычнік. Кобрын**

У рамках праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» прайшоў урок дабрыні «Разгладим морщинки, согреем ладошки».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 18 чал.

## Мерапрыемствы ў рамках Тыдня бацькоўскай любові

На працягу тыдня ўсе мамы і таты, якія прыйшлі ў бібліятэкі сістэмы, мелі магчымасць скарыстацца сэрвіснымі паслугамі бібліятэк бясплатна. Прыемным сюрпрызам стала ўручэнне бацькам малюнкаў і святочных паштовак іх дзяцей.

**14 кастрычнік. Кобрын**

Удзельнікі праекта «От милосердия в книгах – к неравнодушию в жизни» наведалі літаратурную гасціную «Я хранима двумя матерями», у якой прынялі ўдзел паэтка Надзея Момлик і вакальны гурт хору «Дзівінскія напевы».

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 25 чал.

**16 кастрычнік. Кобрын**

У літаратурна-музычнай кампазіцыі «Ты одна такая – любимая и родная» прыняла ўдзел член Саюза пісьменнікаў Беларусі Наталля Кандрашук. Настаўнік беларускай мовы і літаратуры Кіселявецкай СШ Наталля Сілік і яе дачка Варвара выканалі тэматычныя песні, напісаныя на словы мясцовай паэткі Надзеі Момлік.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 26 чал.

**18 кастрычнік. Кобрын**

Вакальная група «Фантазія» правяла літаратурна-музычную вечарыну «Ваш праздник сердечной улыбкой увенчан» у тандэме з вакальнай групай «Встреча» ТЦСАН, артыстамі Кобрынскага сацыяльнага пансіяната «Никольский» і вядомымі паэтамі горада.

Установа, 54 чал.

**Мерапрыемствы ў рамках зборнага раённага графіка наведанняў Установы школамі аддзела адукацыі**

**2, 11, 23 кастрычнік. Кобрын**

Гадзіна патрыятызма «По их судьбе прошла война» арганізавана для навучэнцаў 6 класаў гімназіі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 64 чал.

**8 кастрычнік. Кобрын**

У рамках маладзёжнага патрыятычнага праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» ў чатыльнай зале для навучэнцаў 9 класаў гімназіі г. Кобрына прайшла краязнаўчая гадзіна «К истокам народной культуры».

Установа, 49 чал.

**9, 22 кастрычніка. Кобрын**

Навучэнцы гімназіі г. Кобрына, Лукскай і Пескаўскай сярэдніх школ наведалі інфармацыйна-адукацыйныя гадзіны «Страна, Народ, Президент: 30 лет Президентской власти», прымеркаваныя да трыццатай гадавіны выбрання Аляксандра Лукашэнка першым Прэзідэнтам Беларусі і станаўлення Прэзідэнцкай Рэспублікі.

Установа, 66 чал.

**9, 10 кастрычніка. Кобрын**

Гадзіна гісторыі «Давай ганарыцца, што мы беларусы» прайшла ў пакоі казак для навучэнцаў 7 класаў гімназіі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 35 чал.

**25 кастрычнік. Кобрын**

Ваенна-патрыятычная гадзіна «Ішоў мой край дарогамі вайны» прайшоў у чытальнай зале ў рамках праекта «Беларусі роднай славутыя крокі» для навучэнцаў старэйшых класаў ДУА «Верхалеская сярэдняя школа».

Установа, 15 чал.

**17, 18, 24 кастрычнік. Кобрын**

У чытыльнай зале прайшла інфармацыйна-патрыятычная гадзіна «Брэстчыны роднай славутыя крокі», прымеркаваная да 85-годдзя Брэсцкай вобласці, для навучэнцаў СШ №1, №2 і гімназіі г. Кобрына. Удзельнікі вакальнай групы «Фантазия» Алена Міхейкіна-Белякова і Наталля Раманюк выканалі музычныя кампазіцыі.

Установа, 68 чал.

**Іншыя мерапрыемствы**

**4 кастрычнік. Кобрын**

У рамках абласной інфармацыйна-асветніцкай акцыі «Мы – здоровое поколение Брестчины» і бібліятэчнага праекта «Здоровая молодежь – здоровая

нация» ў чытальнай зале адбыўся урок здароўя «Трезво жить – здорово!». Перад навучэнцамі палітэхнічнага каледжа выступіла ўрач-эпідэміёлаг Кобрынскага занальнага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ірына Ператолчына, кобрынскі паэт, член народнай літаратурна-паэтычнай студыі «Белы бусел» Канстанцін Давідзюк і салісты вакальнай групы «Фантазія» Наталля Раманюк і Алена Міхейкіна-Белякова.

Установа, 18 чал.

**6 кастрычнік. Кобрын**

У чытальнай зале пад кіраўніцтвам Наталлі Кандрашук прайшло чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які працуе пры Брэсцкім абласным аддзяленні Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Установа, 10 чал.

**6 кастрычнік. Кобрын**

Гадзіна зносін «Достучаться до каждого сердца» з удзелам протаіерэя Мікалая Гляда і паэткі Надзеі Момлік, прайшла для настаўнікаў-ветэранаў.

Філіял «Дзівінская сельская бібліятэка», 18 чал.

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81